# мадэрн, рэп і адзінаборствы

СВЯТЛАНА ГУТКОЎСКАЯ

Танцавальнае мастацтва з'яўляецца адным з самых старажытных у кітайскай культуры: іерогліфы, якія абазначалі паняцці «танец» і «музыка», сустракаліся ўжо ў II стагоддзі да н.э. Сёння ў Кітаі актыўна развіваецца сучасная харэаграфія, аб чым сведчыць праграма Гуандунскага танцавальнага калектыву, паказаная — з нагоды адкрыцця Дзён культуры Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі — на канцэрце ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі.

Гэтае выступленне выклікала вялікую цікавасць у аматараў танцавальнага мастацтва. Пра стан і тэндэнцыі развіцця сучаснага танца ў Кітаі прыхільнікі гэтага накірунку ў Беларусі ведаюць перш за ўсё па выступленнях кітайскіх артыстаў на Міжнародным фестывалі сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (IFMC), якія некалькі гадоў запар атрымлівалі галоўныя ўзнагароды, прычым цалкам заслужана. Дастаткова нагадаць цудоўнае выступленне дуэта Гааян Джынзі – Лі Ханзонг, які атрымаў Гран-пры конкурсу за мініяцюру «Светы» («Міры») на XII IFMC: уражвалі як бліскучая балетмайстарская работа, так і бездакорнае выкананне танцоўшчыкамі харэаграфічнага тэксту, тонкая драматычная ігра і надзвычайная эмацыянальнасць.

Гуандунскі калектыў таксама вызначаецца выдатнай тэхнікай. Стыль кітайскіх выканаўцаў можна аднесці да contemporary dance, заснаванага на тэхніцы класічнага танца, якім танцоўшчыкі вельмі добра валодаюць. Камерная танцавальная трупа, якая складаецца з 11 артыстаў, створана ў 1992 годзе пры Дэпартаменце па культуры Гуандунскай правінцыі — спецыяльнай эканамічнай зоны і самай адкрытай правінцыі Кітая — і з'яўляецца ў сябе на радзіме адным з вядучых танцавальных калектываў у сваёй галіне. Мастацкі кіраўнік трупы Вілі Тцао быў спецыяльна запрошаны з Ганконга.

Акрамя музычных нумароў, у праграме канцэрта быў паказаны шэраг харэаграфічных кампазіцый. У рабоце пад назвай «Зіма» на музыку А.Вівальдзі ў цэнтры твора — чалавек, які адчувае на сабе дыханне зімы — самай суровай пары года, што сімвалізуе яго адзіноту ў халодным, жорсткім і абыякавым сучасным свеце. Пяцёра мужчын і чатыры жанчыны ў аднолькавых чорных скураных штанах і апранутых на голае цела пінжаках з застылымі маскамі на тварах механічна рухаюцца ў сцэнічнай прасторы, нібы падпарадкоўваючыся камандзе і нават не заўважаючы адно аднаго. Усё гэтае танцавальнае дзеянне выступае наўмысным эмацыянальным кантрапунктам цудоўнай і меладычнай класічнай музыцы. Танцавальны твор вылучаецца цікавым кампазіцыйным вырашэннем. Балетмайстар вельмі ўдала выкарыстоўвае тут і харэаграфічнае шматгалоссе ў пластыцы выканаўцаў, чаргуючы яго з доўгімі пластычнымі паўзамі, і шматпланавыя танцавальныя малюнкі, арганічна ўплятаючы ў тканіну нумара асіметрычныя пабудовы і нечаканыя пераходы паміж малюнкамі, ствараючы ў выніку яркі вобраз складанага, пабудаванага паводле пэўных непахісных законаў сучаснага свету.

У нейкі момант на сцэне застаецца толькі адзін танцоўшчык, які сваімі экспрэсіўнымі рухамі і выразнымі позамі быццам бы імкнецца на поўны голас «пракрычаць»: «Заўважце мяне! Я існую! Я не падобны да іншых!» Нумар «Гульня» вылучаўся перш за ўсё падборам музычнага матэрыялу. Гэта была сучасная музыка ў стылі рэп з вакалам на кітайскай мове. Усе трое выканаўцаў у яркіх модных топах і шта-



ФОТА АНДРЭЯ СПРЫНЧАНА

**Харэаграфічная кампазіцыя «Гульня».**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Харэаграфічная кампазіцыя «Царыца».



нах выглядалі як тыповыя прадстаўнікі сучаснай моладзі: яны трымалі ў руках традыцыйны атрыбут старажытных кітайскіх народных танцаў — веер, умела ім маніпулявалі, нібы дапісваючы кожны свой рух, падкрэсліваючы кожную позу. Мініяцюра адлюстроўвала сяброўскія ўзаемаадносіны дзяўчыны і двух хлопцаў і ледзь заўважныя моманты саперніцтва паміж маладымі людзьмі. У танцавальнай лексіцы выканаўцаў арганічна спалучаліся тыповая пластыка мадэрна, рэзкавыя рухі і элементы ўсходніх адзінаборстваў. Лёгкая жартоўная танцавальная мініяцюра, выкананая натуральна і вольна, сапраўды нагадвала гульню. Можа, маладое пакаленне і на жыццё глядзіць як на цікавую гульню, якая ніколі не надакучыць? А можа, гэта спосаб схавацца ад складанай рэчаіснасці? У гэтай рабоце відавочным быў нацыянальны кітайскі каларыт, такі прывабны для еўрапейскага гледача.

Гэты каларыт яшчэ больш яскрава выявіўся ў харэаграфічнай кампазіцыі «Царыца». Пастаноўку смела можна назваць міні-спектаклем з вылучэннем салістаў і кардэбалету. Уражанню драматычнага спектакля спрыялі і актыўнае выкарыстанне ў дзеянні сцэнічнага касцюма як моцнага выразнага сродку, і відэарад, які дэманстраваўся на задніку на вялікім экране. Дзве тэмы — кітайская народная і сучасная — гарманічна спалучаліся ў музычным суправаджэнні гэтай пастаноўкі. Перад намі разыгралася сапраўдная трагедыя двух закаханых, якія знаходзяцца на розных полюсах: яна — на самым версе сацыяльнай лесвіцы, а ён, як просты смяротны, — у самым яе нізе. Цягам дзеяння яны мяняюцца ролямі, але ...

На цалкам зацемненай сцэнічнай пляцоўцы прамень святла выхоплівае ў левым куце авансцэны адзінокую фігуру жанчыны ў царскім галаўным уборы, з цудоўным веерам у руках, апранутую ў шыкоўныя традыцыйныя строі, якія сваёй дакладнасцю нагадваюць экспанат этнаграфічнага музея.

Яе выразныя рухі, хоць і скаваныя прадпісаннямі палацавага этыкету, красамоўна сведчаць пра палкую любоўную жарсць, што цалкам валодае ёю. Жанчына — у палоне сваіх гарачых пачуццяў да мужчыны, які з'яўляецца ў іншым крузе святла на процілеглым канцы сцэны. Дуэт, вырашаны сродкамі танца мадэрн з арыгінальнымі падтрымкамі і дакладна выверанымі жэстамі, кранае праўдзівасцю і эмацыянальнай напоўненасцю. Выступленне Гуандунскага калектыву сведчыць пра тое, што аналагеты сучаснай харэаграфіі ў Кітаі паспяхова засвойваюць актуальныя танцавальныя сістэмы, кіруючыся дасягненнямі аўтарытэтных у гэтай галіне еўрапейцаў і амерыканцаў у прыёмах арганізацыі пластычнага матэрыялу, спосабах трансфармацыі выразных сродкаў харэаграфіі, выкарыстанні здабыткаў іншых відаў мастацтва, звароце да музыкі самых розных напрамкаў і жанраў. Разам з тым кітайскія харэографы актыўна шукаюць новыя шляхі развіцця сучаснага танца ў сваёй краіне, імкнуцца надаваць сучаснай танцавальнай дзеі нацыянальны каларыт.



Харэаграфічная кампазіцыя «Зіма».